P.S. *Александр Григорьевич, заранее хочу извиниться за синтаксический, орфографический и стилистический мусор, привнесенный в книгу моим издателем. Другого я не нашел (все боятся обещанной "перерегистрации"), а этому я благодарен уже лишь потому, что он "отважился" издать эту "крамольную" книгу. Две-три правки я внес в книгу рукой, иначе фразы вообще потеряли бы смысл".*

Пишу эти строки, когда перевернута последняя страница книги "Ночь без сна". Опять возвращаюсь к подаренной одинокой женщиной мысли... Виктор Благодарный остается благодарным жизни, хотя для него она далеко не сладкая.

Болеслав СУШКЕВИЧ.

Ліст з глыбінкі

Пад катэджы зямля ёсць, а пад пашы — няма

Добры дзень, паважаная рэдакцыя газеты "Народная воля"!

Піша вам грамадзянка Л.Д.Купрыяновіч з пасёлка Мікашэвічы. Пішу па адной набалелай для ўсіх нас праблеме. У нас няма пашаў для кароў. На другой Мельнічнай вуліцы — 45 галоў кароў, а на нашай першай Мельнічнай — 30. Ужо больш за 10 гадоў каровы пасвяцца на голай паляне, каля шашы. Было поле, ды мясцовыя ўлады аддалі пад дачы, а на іншых пашах растуць, як грыбы, катэджы.

Мы не аднойчы звярталіся па дапамогу да работнікаў райвыканкама і яго старшыні А.І.Волчыка. Але ні райвыканкам, ні мясцовы пасялковы Савет не хочуць нічога рабіць. Адказалі нам, што грошы на паляпшэнне пашаў ужо выдзелены і што голыя паляны будуць узараны восенню і засеяны травой. Скончылася восень, паляны перааралі, але на іх нічога не пасеялі.

У лес кароў не пагоніш. Усюды таблічкі "Высокая радыяцыя". Што ж нам рабіць?

Мы вас просім, дапамажыце нам у вырашэнні гэтага пытання, каб хоць невялікую плошчу пакінулі на лета пад пашы. Просім яшчэ раз: калі можаце — дапамажыце!

З павагай да вас жыхары пасёлка Мікашэвічы Лунінецкага раёна —

Купрыяновіч, Грыцкевіч, Лукашэвіч, Капліч, Пуцель, Ананька, Нагар.

Жыццё, як яго бачыць журналіст Уладзімір ШЫК

Лёс чалавечы

Трагічная гібель прынцэсы Дзіяны, здаецца, ускалыхнула не толькі Брытанію. Прычыны аварыі, акалічнасці жыцця і смерці прыгожай бландзінкі яшчэ доўга будуць займаць людзей ва ўсім свеце. Прыкладна ў гэты ж час у беларускай глыбінцы адбылася яшчэ адна, толькі ўжо непрыкметная аўтаварыя. Аб ёй не пісалі газеты, смерць 63-гадовага калгаснага пенсіянера з Мядзельскага раёна засталася незаўважанай, нераўнадушнымі да яе засталіся хіба што родныя і аднавяскоўцы.

Каля вёскі Пятровічы загінуў мужчына 1933 года нараджэння. Загінуў раптоўна на месцы. Адразу, як толькі аўтамабіль, у якім чалавек ехаў, з прасёлачнай дарогі выскачыў на шашу Полацк — Вільнюс і быў збіты едучым на хуткасці аўтафургонам. Удар быў настолькі моцным, што калгасны "газончык" ужо не падлягае рэстаўрацыі. Атрымаў раненні, але будзе жыць кіроўца, зусім малады 19-гадовы студэнт тэхнікума, які праходзіў практыку ў калгасе. Аднак лёс пацярпелага хлопца незайздросны. Ён цяпер пад следствам, наперадзе суд і, магчыма, некалькі гадоў турмы напачатку самастойнага дарослага жыцця. Віна вадзіцеля відавочная, бо ён груба парушыў правілы дарожнага руху, не спыніўся на знак "Стоп". Магчыма, панясуць нейкія спагнанні калгасныя спецыялісты, бо ёсць версія, што не надта спраўная была тармазная сістэма ў знішчаным аўтамабілі. Драматызм сітуацыі яшчэ ў тым, што бацька юнака, што сеў за руль, — галоўны інжынер.

Некалькі гадзін у кузаве грузавіка жыў і яўна не разумеў узнікшай мітусні ладны 140-кілаграмовы парсючок, адзіны, хто застаўся цэлы і непашкоджаны. Праўда, і ён праз некалькі гадзін пайшоў пад нож, бо прызначаўся для гэтай мэты. Свінчо якраз і не давезлі да мэты паездкі на размешчаны праз нейкі кіламетр мясаперапрацоўчы цэх. Прыватная фірма, якая ім валодае, з сям'ёй нябожчыка назаўтра разлічылася. Выручаныя чатыры з паловай мільёны рублёў і пайшлі на пакрыццё расходаў на пахаванне.

Многія прыгаданаму мной факту нават здзівяцца. Маўляў, няма тут нічога такога дзіўнага, колькі падобных трагедый адбываецца ў краіне штодзень. І зробяць выснову, што гэта здарэнне — просты збег абставін, звычайная наша нядбайнасць, якія прывялі да бяды. Так то яно так, але мяне турбуе іншае. Мы прывыклі, мы застаёмся раўнадушнымі да чужога гора. З іншага боку зусім па-другому глядзіш на сітуацыю, калі ведаеш, што незадоўга да сваёй гібелі быў механізатар купіў сабе каня. На пакрыццё доўгу і спатрэбіліся яму грошы. Значыць, хоць пад канец жыцця марыў ён нарэшце зажыць па-чалавечы, вольна працаваць сабе на сваім уласным гектары зямлі.

Мне не давялося ведаць загінуўшага, але чамусьці ягоны лёс моцна крануў. Дзяцей у нябожчыка не было, дык ці быў наогул шчаслівы ў жыцці? Як цяпер далей жыць стаўшай зусім адзінокай у адзін момант ягонай жонцы? І трэба было няшчасцю здарыцца менавіта ў тую ракавую хвіліну. Траса ў тым месцы хоць і ажыўленая, але спакойна можна было там пераехаць хоць тысячу разоў, і нічога б не здарылася. Ці не лепш было б выдзеліць для паездкі больш спраўную машыну і пасадзіць за руль больш вопытнага вадзіцеля? Нарэшце, як складзецца далейшы лёс таго хлопца, якому, пэўна, давядзецца несці свой крыж пакуты праз усё жыццё? Пытанні, пытанні, і няма на іх адназначнага адказу. Але давайце задумаемся, чаму мы такія абыякавыя да свайго лёсу, лёсу родных, блізкіх, з чаго ўрэшце складваецца лёс краіны.

Вось у маім журналісцкім блакноце занатавана адна жудасная лічба. На працягу толькі аднаго тыдня ў нас на Віцебшчыне маглі б жыць, але самі добраахвотна пайшлі з жыцця адразу 8 чалавек. Колькасць самазабойстваў сярод моладзі, як паведамляе штотыднёвік "Свободные новости", зараз складае на Беларусі 24 хлопцы і 5 дзяўчат (да ведама таго ж БПСМ) на сто тысяч насельніцтва. Становіцца яўна не па сабе, калі даведваешся, што ў адзін толькі дзень у вобласці на могілках у Чашніцкім раёне павесілася 30-гадовая сакратар камісіі па справах непаўналетніх, у лесапасадцы абласнога цэнтра наклаў на сябе рукі 25-гадовы мужчына, пенсіянерка з Наваполацка выкінулася з акна шматпавярховага дома. Падобныя жудасныя паведамленні ідуць кожны дзень, і штогод расце гэта страшная статыстыка.

Значыць, не ўсё так добра ў нашым жыцці. Мы прызвычаіліся, нікога з нас ужо не здзіўляе, што ўсё больш побач людзей, якія не могуць звесці канцы з канцамі. Мы змірыліся і ўжо не заўважаем няспыннага росту цэнаў, растучае беспрацоўе, злачыннасць, мізэрныя заробкі, пенсіі. Нам, па сутнасці, напляваць, што зараз так многа людзей у турмах, столькі пакінутых немаўлят у Дамах дзіцяці, столькі нямоглых старых у Дамах састарэлых. Нам так утульна ў сваім уласным дамку і ўсё роўна, куды коціцца Беларусь і які лёс чакае нашых дзетак. Пакуль лёс любога канкрэтнага чалавека не стане турбаваць усіх і кожнага, нам на сваёй зямлі лепшай долі ніколі не бачыць.

Сітуацыя

Беларускія валютчыкі адсвяткавалі свой "чорны аўторак"

У Беларусі замежная валюта зноў з'явіцца ў свабодным продажы. Нацыянальны банк краіны ўстанавіў, што з 2 снежня банкі і дылінгавыя кампаніі атрымліваюць права свабодна ўстанаўліваць курс куплі і продажу наяўнай валюты пры правядзенні здзелак з фізічнымі асобамі. На "чорным" рынку гэта навіна зрабіла эфект узарванай бомбы. Ценявы бізнес зноў страціў манаполію на валютаабменныя аперацыі. Напрыклад, да апошняга часу рыначны курс амерыканскага долара амаль на 30 працэнтаў перавышаў афіцыйны. У гэтай сітуацыі большасць грамадзян проста вымушана была звяртацца да паслуг прыватных мянял.

На думку спецыялістаў, момант для ўвядзення свабоднага курсаўтварэння выбраны даволі ўдачны. На працягу некалькіх тыдняў рэальны кошт долара складаў каля 37 тысяч рублёў. Аднак у перадНавагоднія дні традыцыйна павышаецца попыт на рублёвую наяўнасць — насельніцтва робіць святочныя пакупкі і вызваляецца ад доларавых накапленняў. Можна чакаць, што "зайчык" нават крыху прыбавіць у вазе.

Зрэшты, гавараць аб поўнай лібералізацыі дзяржаўнай валютнай палітыкі пакуль што рана. Юрыдычныя асобы пры правядзенні здзелак на пазабіржавым рынку па-ранейшаму павінны прытрымлівацца афіцыйнага курсу Нацбанка.

Уладзіслаў ПЛАТУН.

Ведай нашых!

Аркестр Фінберга працуе, як цэлая філармонія

Дзяржаўны канцэртны аркестр пад кіраўніцтвам народнага артыста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Міхаіла Фінберга ўносіць ажыўленне і яркія фарбы ў культурнае жыццё не толькі нашай краіны. Як стала вядома карэспандэнту БелТА, са сваёй новай праграмай калектыў паедзе ў Маскву, дзе 9 снежня па запрашэнні Канцэртнай залы "Расія" прыме ўдзел у юбілейным канцэрце Рэната Ібрагімава. У дзень свайго 50-годдзя спявак выканае свае лепшыя песні ў суправаджэнні аркестра.

Нямала новых прыемных сюрпрызаў рыхтуе маэстра Фінберг і для беларусаў. Калектыў працуе над новай праграмай, прымеркаванай да чарговага з'езда Саюза кампазітараў рэспублікі. Гэта будзе аўтарскі вечар народнага артыста СССР кампазітара Яўгена Глебава. Акрамя таго, аркестр і яго салісты рыхтуюць музычныя падарункі да Новага года. А сам Міхаіл Фінберг і яго калектыў атрымалі ўжо адзін калядны падарунак — у Італіі выйшаў кампакт-дыск з запісамі Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі.

Віктар КУКЛОЎ, БелТА.

Стоп-кадр



В честь шестисотлетия поселения татар на территории Беларуси в столице будет построена Минская соборная мечеть. На улице Грибоедова состоялась торжественная церемония закладки мечети. Мечеть будет воздвигнута на месте бывшего татарского кладбища. На торжественной церемонии присутствовала правительственная делегация Республики Татарстан.

На снимке: *на торжественной церемонии закладки мечети выступил премьер-министр Татарстана Фарид Мухаметшин.*

Фото Виктора ТОЛОЧКО, БелТА.

Пра бяздомных дзяцей паклапаціўся гарвыканкам

Бабруйскі гарвыканкам прыняў рашэнне аб стварэнні гарадскога прытулку для непаўналетніх. Ён павінен стаць часовым прыстанішчам для беспрытульных і бяздомных дзяцей, якія з'явіліся апошнім часам у горадзе, пакуль яны не будуць уладкаваны ў інтэрнаты або вернуты ў сем'і. Як стала вядома карэспандэнту БелТА, такіх дзяцей ва ўзросце ад трох да чатырнаццаці гадоў у Бабруйску налічваецца ўжо да трох дзесяткаў.

Прытулак размесціцца ў былым дзіцячым садзе аднаго з мясцовых прадпрыемстваў. Тут дзеці будуць пад наглядам медыцынскіх работнікаў, педагогаў, псіхолагаў. Іх забяспечаць усім неабходным.

Усе затраты на ўтрыманне прытулку, а гэта прыкладна два з паловай мільярды рублёў у год, гарвыканкам узяўся фінансаваць са свайго бюджэту.

Мікалай НАЗАРОВІЧ, БелТА.

Печально!

Республика мертвого кино,

или Почему известный режиссер Игорь Добролюбов снял фильм, главный герой которого повесился

Степень известности кинорежиссера Игоря Добролюбова абсолютно не соответствует его нынешней материальной обеспеченности. Он получает жалкую пенсию. Одним словом, как говорит сам Игорь Михайлович, заначек делать не из чего. Посему всю свою пенсию он исправно отдает своему домашнему министру финансов — супруге Нелле Ивановне.


— Спасибо сыновьям. Если бы они не помогали нам финансами, мы бы с женой не выжили. Однако во всех цивилизованных странах более-менее известные режиссеры живут на авторские проценты. У нас же в республике закон об авторском праве пока не действует. Иначе бы только с "Белыми росами" и "Иваном Макаровичем" я мог бы безбедно жить очень долгое время. И детям еще помогать...

— Игорь Михайлович, мне, честно говоря, с трудом верится, что в обозримом будущем белорусские кинорежиссеры смогут себе позволить обеды в фешенебельных ресторанах, костюмы от известных кутюрье и иные роскошества. Практически все наши известные кинорежиссеры — многократные лауреаты конкурсов и фестивалей, со всяческими званиями, сегодня ничего не снимают. Вячеслав Никифоров, Валерий Рыбарев, Игорь Добролюбов...

— Просто мы сегодня никому не нужны. Такие как нынешний министр культуры Александр Сосновский и его заместитель Юрий Цветков (который, к слову, курирует вопросы, касающиеся кинематографа) губят национальную кинематографическую культуру. Они заживо хоронят все лучшее, что было когда-то сделано. Поэтому я вышел из правления Союза кинематографистов. Не могу больше молча наблюдать за всем происходящим. Убежден, что Белорусский союз кинематографистов совместно с тем же Цветковым должен заниматься сохранением и возрождением белорусского кинематографа, положением дел на киностудии и в Белвидеоцентре. Но о чем у нас можно говорить, если в экспертном совете при Министерстве культуры нет ни одного творческого человека с Именем, работами которого можно было бы гордиться. А творения режиссеров там оценивают. И еще как!



Игорь Добролюбов сейчас...



...и много лет назад.

— В недалеком прошлом в Москве весьма успешно работали высшие сценарные курсы. Туда ездили учиться доктор наук, профессор БГУ Алесь Адамович, Чесик Адамчик и многие другие известные люди...

— Нашим учиться не надо: дали деньги — они будут воять. Хотя это — чистой воды разбазаривание государственных денег.

— Сегодня все говорят: у нас нет кино, потому что нет денег. Как Вы считаете, смогут ли большие деньги спасти белорусское кино?

— На мой взгляд, когда ведется разговор о деньгах, которые будут великодушно кем-то даваться, настоящего кино никогда не будет. Потому что тот, кто платит, как известно, и музыку заказывает. В данном случае, естественно, сценарий. Представьте, какой белорусский суперфильм получится, если наше Министерство культуры утвердит полюбившийся ему сценарий... Да и в конце концов уже можно понять: если нет денег на съемку полнометражных фильмов, нужно снимать короткометражные...

— Но президент же посетил киностудию "Беларусьфильм". И деньги пообещал дать на *супер*-*фильм*...

— Люди, далекие от киноискусства, не знают о том, что киностудия состоит из двух организаций: фабрики, где делают техническую работу, и студии, где работают мозги, — творческие люди, которые, собственно, снимают фильмы и делают то, что потом называется кино. Лукашенко был именно на кинофабрике...

— Игорь Михайлович, гордость белорусского кинематографа — "Альпийская баллада" Бориса Степанова, "Город мастеров" Владимира Бычкова, удивительные картины Валерия Рыбарева и Вячеслава Никифорова (кстати, лауреата Государственной премии СССР). А что стоящего снято белорусскими кинематографистами за последние годы?

— Ничего. Потому что каждое правительство подбирает художников себе под стать...

...Уходя от Добролюбова, я почему-то вспомнила его последнюю работу — картину "Эпилог". Ее главный герой, талантливый художник, повесился. Несмотря на то, что весьма успешно продал свои картины за рубеж и, на первый взгляд, мог спокойно жить и творить дальше. Но он не мог работать в стране, которой было наплевать на него. У себя на родине он был никому не нужен...

Народный артист БССР, кинорежиссер Игорь Добролюбов в белорусском киномире ничего изменить не может. Потому что тоже... никому не нужен. Невостребован...

На такую страну иметь такое количество режиссеров и слыть республикой мертвого кино... А в это время Александр Григорьевич, совершенно не стесняясь, скорее наоборот, с нескрываемой гордостью в голосе сообщает белорусской общественности: российский фильм "Любить по-русски" Евгения Матвеева снимался при поддержке (и немалой) президента Республики Беларусь. В фильме Матвеева любят по-русски. Но за белорусские деньги. Выходит, "Любить по-белорусски" будем за российские?

Вот такие киношные метаморфозы. А может, и не киношные вовсе, а политические? В любом случае, в проигрыше оказывается белорусское кино. То кино, которое можно называть настоящим, а не подогнанным под чей-то высочайший заказ...

P.S. В воскресенье, 7 декабря, в "Золотой серии" на ОРТ — "Белые росы" народного артиста БССР, кинорежиссера Игоря Добролюбова.

Марина КОКТЫШ.

Народная Воля
5 СНЕЖНЯ 1997 г.

Дайджест

Расовая проблема США решится скоро. Белых американцев станет не более 55 процентов

Газета "Детройт Ньюз" посвящает статью результатам, к которым приводят старания американского правительства увеличить этническое разнообразие Соединенных Штатов. Как отмечает газета, сегодня Америка переживает так называемый "расовый пессимизм", а это означает, что расовая принадлежность становится в Америке чуть ли не первым фактором, способным объяснить все, начиная с уличного ограбления и кончая экономическими проблемами. Однако, отмечает газета, проблема "расового пессимизма" нисколько не отражается на увеличении потока эмигрантов из разных концов света. Более того, по прогнозам ученых, демографическая ситуация в Америке со временем резко изменится. Число белых американцев сократится и составит не более 55 процентов всего населения США.

Восточная Европа не заметила... демократического превосходства

Газета "Джермани Лайв" анализирует ситуацию, которая сложилась в странах Восточной Европы после падения в них коммунистического режима. Газета отмечает, что страны бывшего социалистического лагеря представляют собой в настоящее время достаточно неприглядную картину. Газета сообщает, что по данным статистики, практически в каждой восточноевропейской стране после начала экономических реформ катастрофически выросли безработица, преступность, наркомания и прочие негативные явления, не присущие цивилизованному обществу. По мнению газеты, такая ситуация и печальный опыт стран Восточной Европы ставят под сомнение саму идею демократического общества и превосходства капиталистической системы хозяйствования.

Израильские ракеты для... польских вертолетов. На борту

Газета "Шверинер Альгемайне" публикует материал, посвященный ходу военной реформы в Польше. Газета сообщает, что польское правительство впервые за всю современную историю страны решило закупить крупную партию оружия не у России. По информации газеты, в настоящее время уже практически готов к подписанию договор между Польшей и Израилем на покупку большой партии ракет для новых моделей польских вертолетов. По оценкам экспертов, сумма сделки может превысить восемьсот миллионов долларов. Газета отмечает, что польские власти намерены заключить эту сделку, несмотря на то что израильская продукция является далеко не лучшей и при этом одной из самых дорогих. Однако, пишет газета, закупка столь крупной партии оружия имеет для Польши не практическое, а скорее политическое значение. Целью же сделки, по мнению газеты, является исключительно только демонстрация России своей независимости.

Подлодки "Трайдент", сменившие "Поларис", снова перевооружаются

Лейбористское правительство Великобритании приняло решение закупить в США 7 ракет с ядерными боеголовками для подводных лодок "Трайдент", сообщает "Рейтер". Стоимость ракет составляет 162 миллиона долларов. По мнению экспертов, закупка ракет свидетельствует о стремлении правительства сохранить подлодки "Трайдент" в качестве основы британских ядерных сил в следующем веке. Общее количество ядерных ракет этого класса составит 58 единиц. Газета "Дэйли Телеграф" подчеркивает, что левое крыло правящей партии выразило резкое недовольство решением правительства. Ведь в 1987 году лейбористы проводили кампанию против закупок подлодок "Трайдент" и требовали снятия с вооружения тогдашней основы британских ядерных сил — подводных лодок класса "Поларис".

В США рассекретили бюджет ЦРУ. Впервые за 50 лет

Впервые за последние 50 лет в США обнародован ежегодный бюджет ЦРУ и других разведывательных ведомств, сообщает лондонская газета "Таймс". По словам директора ЦРУ Джорджа Тенета, он составляет 26 миллиардов 600 миллионов долларов. Бюджет ЦРУ считался одним из самых главных секретов Вашингтона. Решение об обнародовании бюджета разведывательного ведомства было принято президентом Клинтоном еще в прошлом году. Президент посчитал, что это не нанесет ущерба деятельности ЦРУ.

Подготовила **Светлана РОСТОВА.**

Латвия

Президент Гунтис Улманис выступает за то, чтобы латыши играли "определяющую роль" в жизни страны

Шведские и латвийские средства массовой информации неверно трактуют отношение президента Гунтиса Улманиса к проблеме предоставления латвийского гражданства нелатышам. Заявление об этом распространила на днях пресс-служба главы государства.

Как подчеркивается в заявлении, некоторые СМИ интерпретируют отдельные высказывания Г.Улманиса столь вольно, что может сложиться впечатление, будто бы он выступает за предоставление латвийского гражданства всем негражданам сразу, проводя таким образом политику Москвы. Это абсолютно "не соответствует убеждениям президента и государственной политике", говорится в заявлении.

На самом же деле, разъясняет пресс-служба, Г.Улманис всегда высказывался за то, чтобы представители коренной национальности играли "определяющую роль в своей стране" при уважении прав "людей других национальностей, живущих в Латвии".

К сведению. 18 ноября Г.Улманис высказался за необходимость пересмотреть соглашение о сотрудничестве парламентских фракций, если оно будет тормозить процесс предоставления гражданства негражданам. Это мнение президента вызвало оживленную дискуссию в обществе и было подвергнуто резкой критике руководством фракции "Отечеству и свободе"/Движение за национальную независимость Латвии.

Вокруг нас

Литва

Альгирдас Бразаускас называет "позором стран Балтии" нерешенность вопросов контроля на внешних и внутренних границах

Президент Литвы Альгирдас Бразаускас назвал "позором стран Балтии" то, что за семь лет независимости они "не сумели навести порядок на внешних и внутренних границах".

Открывая международную конференцию "Контроль за внешними границами Европы в контексте включения стран Балтии в Европейский Союз", глава Литвы заявил, что "всем трем странам Балтии должно быть стыдно за то, что они, стремясь в ЕС, не смогли создать единую информационную пограничную систему".

По словам А.Бразаускаса, только обеспечив надежный пограничный контроль, страны Балтии смогут "привести в порядок границы с Россией и Беларусью, которые в будущем обязательно станут восточными границами ЕС".

Российская Федерация

Москва хотела бы видеть Швецию членом "международного клуба друзей России"

Как сообщил "Интерфаксу" помощник президента Сергей Приходько, российское руководство хотело бы видеть Швецию членом своеобразного "международного клуба друзей" нашей страны.

Тем самым, считает помощник Бориса Ельцина, Швеция оказала бы реальное содействие проведению демократических и социально-экономических преобразований в нашей стране, полномасштабной интеграции России в мировое сообщество.

По словам С.Приходько, государственный визит Б.Ельцина в Швецию можно по праву назвать "историческим" для двусторонних отношений уже потому, что глава российского государства последний раз посещал эту страну в 1909 году. До этого было всего три обмена визитами на высшем уровне.

Украина

Леонид Кучма удерживает лидерство в номинации "Государственный деятель года"

Генеральная дирекция общенационального конкурса "Человек года-97" подвела итоги опроса за октябрь. В номинации "Государственный деятель года" лидерство оказалось за президентом Леонидом Кучмой.

На пресс-конференции в Киеве председатель правления дирекции конкурса Аркадий Райцин сообщил, что в номинации "Политический лидер года" в октябре лидером был председатель общественного объединения "Согласие" экс-президент Украины Леонид Кравчук, в номинации "Парламентарий года" — председатель Верховного Совета Александр Мороз.

В номинации "Самое значительное событие года" наибольшее количество баллов набрало подписание широкомасштабного договора между Украиной и Россией.

В номинации "Открытие года" лидером стал вице-премьер Украины Сергей Тигипко.

Грузия

Эдуард Шеварднадзе не доволен подготовкой энергетического комплекса страны к работе в зимних условиях

Президент Грузии Эдуард Шеварднадзе считает нецелесообразным пребывание на своих постах ряда руководителей энергосистемы страны. Об этом глава государства заявил на расширенном заседании правительства, на котором рассматривался вопрос о положении в энергетическом комплексе страны и мерах по подготовке к нынешней зиме.

Президент поставил вопрос об освобождении с занимаемых должностей первого заместителя министра топлива и энергетики Реваза Арвеладзе, генерального директора государственной компании "Сакэнерго" Важа Метревели, генерального директора государственной компании "Сакэнергогенерация" Нодара Бадурашвили, директора муниципального предприятия тбилисской электросети Акакия Габричидзе.

Э.Шеварднадзе отметил, что они не сумели рационально использовать выделенные средства, чтобы вывести отрасль из кризиса и подготовить энергосистему к нормальному функционированию в зимних условиях.

По словам президента, только за последние два года в реабилитацию энергосистемы Грузии было вложено почти четверть миллиарда долларов США, большая часть которых получена была в виде иностранных кредитов. Тем не менее энергосистема страны по-прежнему оказалась не готовой хотя бы минимально обеспечить электроэнергией население, а также работу жизненно важных объектов и промышленных предприятий.

Между тем, как сообщил на совещании министр топлива и энергетики Давид Зубиташвили, возобновились поставки российского природного газа на Тбилисскую ГРЭС, которые были прекращены несколько месяцев назад из-за задолженности Грузии в размере около $10 млн.

По материалам "Интерфакса".

Бюст Тиры Бэнкс скрылся за тремя миллионами

Популярная супермодель примерила самый дорогой в мире бюстгальтер



На такой женщине будет смотреться бюстгалтер даже за 3 доллара.

В предновогодний месяц владельцы некоторых респектабельных магазинов на Западе любят преподносить своим клиентам небольшие сюрпризы. На этот раз отличился нью-йоркский универмаг "Секрет Виктории". Его модельеры совместно с известным ювелиром Гарри Уинстоном изготовили чудо-бюстгальтер, стоимость которого — три миллиона долларов! Чести покрасоваться в нем была удостоена известная темнокожая супермодель Тира Бэнкс. Что и неудивительно: на ее почти идеальной фигурке этот предмет женского туалета смотрится просто потрясающе. Правда, выставив на всеобщее обозрение трехмиллионный бюстгальтер, она тут же, от греха подальше, скрылась от толпы зевак в бронированном автомобиле. Что тоже, впрочем, понятно.

Ярослав КАРАМОВ.
("КП")

Непрыдуманыя гісторыі

Ліхалецце

Купрыян Валовіч прачнуўся на досвітку, калі праз аканіцы ледзь прабіваўся золак. Падняўшыся з ложка, апрануўся, перахрысціўся на абразок у кутку хаты і, пазяхаючы, выйшаў у сенцы. Там было цямнюсенька і патыхала сырасцю. Намацаўшы каля кадушкі конаўку, зачэрпнуў вады, выпіў адным махам і, выціраючы рот рукавом, адчыніў дзверы ў двор.

У паветры адчуваўся ранні халадок, а ў голлі дрэў пачынаў ажываць вясёлы гоман птушак. Скруціўшы з самасаду цыгарку, Купрыян закурыў. Усмак зацягнуўшыся, праз дым глядзеў на ружовы ўсход сонца. Ля ног яго, віляючы хвастом, цёрся Кудлік — шэры дварняка. Купрыян зірнуў у адданыя вочы кудлатага і рукою прайшоўся па яго спіне. Задаволены Кудлік спакойна ўлёгся ля ног гаспадара.

Купрыян задумаўся. Ужо каторы дзень не пакідаў яго сумны настрой. У раёне пачалася калектывізацыя. Што гэта такое, не ўсе добра ведалі. Хадзілі розныя чуткі, і кожны ўспрымаў іх на свой лад. Адчуванне трывогі закралася ў душу Купрыяна і, як драпежны звер, капцюрамі ўпілося ў сэрца. Што магло стацца, балюча было і думаць.

Яшчэ ўвесну прыязджаў з горада чалавек. Гаварыў пра новае жыццё, бударажыў сялянскую душу абяцанкамі пра справядлівасць, што ўсё будзе рабіцца па нейкай сацыялістычнай законнасці. Але гэта былі толькі словы. Як яно будзе на самой справе, Купрыян не ведаў. "Чаму быць, таго не пramінуць", — уздыхнуў ён і, дакурыўшы, падаўся да хлева.

Там на гнойнай падлозе стаяла чарнабурая карова з белай пралысінай. У адгароджаным кутку рохкала свінаматка. На седале варушыліся каля дзесятка курэй. У другой палове хлева стаяў гняды грывісты конь. Купрыян падышоў да каня, пяшчотна пагладзіў яго шурпатай далонню. Да гнядога ён ставіўся асабліва. Шанаваў яго, ганарыўся ім. Зваў яго Гнедка.

Гнедка быў надзейным памагатым у яго сялянскай справе. Купрыян ніколі не крыўдзіў яго. Своечасова карміў, паіў — трымаў у целе. Часам уначы ўставаў праведваць, каб на сэрцы было спакайней. Гнедка быў канём паслухмяным, у працы руплівым, старанным. Добра разумеў свайго гаспадара.

Напаіўшы і накарміўшы каня аўсом, Купрыян выйшаў у двор. Дзесьці зусім блізка забрахалі сабакі. Кулік навастрыў вушы і рвануўся да агароджы. За варотамі пачуліся галасы, хтосьці па-бруднаму вылаяўся. На брамцы залязгала клямка. Купрыян пайшоў адчыняць.

За парогам стаялі трое: двое ў міліцэйскай форме, трэці — у кожанай тужурцы. Напэўна, старэйшы. Твар худы, шэры, нявыспаны.

— Купрыян Валовіч? — упэўнена запытаўся ён і першым увайшоў у двор.

Кудлік ашчацініўся і зарычаў.

— А ну, забяры свайго шчанюка і пакажы гаспадарку. Мусіць, шмат чаго ўжо схаваў, — з'едліва прагаварыў міліцыянер з мужыцкай фізіяноміяй. Погляд нядобры, злы.

Старэйшы пайшоў да хлева, кідаючы па дарозе вострым пазіркам. Агледзеўшы хлеў, зайшоў у хату. Прайшоўшыся вачыма па хаце, чалавек у тужурцы строга загадаў:

— Заўтра пагрузіш зерне, птушак, усю жывёлу і адвязеш у Тарасава на калгасны двор. Там у сельсавеце атрымаеш даведку аб дабравольнай здачы. Таксама пакінеш там і свайго каня з возам.

Сэрца ў Купрыяна быццам спынілася, губы пабялелі, а язык прысох у роце. Жонка Купрыяна, Антаніна, стаяла моўчкі каля печы, дзе спалі іх малыя дзеці. Твар яе пакрыўся чырвонымі плямамі, а рукі нервова задрыжэлі.

— Як жа жыць будзем? — нібы ачнуўшыся ад кашмарнага сну, ціха прамовіў Купрыян.

— А на тое, што схаваў. Няма тут чаго з вамі, кулакамі, поркацца! — з запалам выбухнуў малады служака.

Маці Антаніны — старая, з праваліўшыміся губамі і з трасучай, як у ліхаманцы, галавою, бухнулася ў ногі старшому.

— Родненькія мае, даражэнькія, не губіце, пашкадуйце, — галасіла яна і памкнулася ўхапіць яго за руку.

Той моўчкі вывернуўся і выйшаў з хаты. За ім падаліся і двое міліцыянераў. На печы заплакалі малыя.

Старая папаўзла ў кут і пачала маліцца на ікону Божай маці. Купрыян з пабялеўшым тварам сядзеў на зэдліку і глядзеў у адну кропку. "Божа ж ты мой, — думаў ён. — Працаваў з самага ранку да самага цямна, не шкадуючы ні сіл, ні здароўя. А цяпер гэта набытое з такой цяжкасцю пяройдзе ў чужыя рукі".

Купрыян быў у поўнай роспачы. Не ведаў, што рабіць. Хадзіў да іншых сялян, якіх таксама абабрала ўлада. Але ў кожнага былі свае клопаты. Купрыян разумеў — прыйшла пара ліхалецця. Чакаць літасці ад улады не прыйдзецца. Як кажуць, ад смерці не адкупішся.

Праз тры дні жонка Купрыяна, пагрузіўшы ў воз свінаматку, курэй, зерне, прывязаўшы да воза карову, павезла ўсё ў прызначанае месца. Асабліва цяжка было Купрыяну развітвацца з конікам. Доўга абдымаў ён яго за шыю, цалаваў у морду, вочы, губы — быццам праводзіў яго на могілкі. А калі зачыніў за імі браму, каб не надрываць душу і сэрца, напіўся, пайшоў за гумно і праспаў там да самай цемры.

Некалькі дзён хадзіў Купрыян нібы сам не свой. Колькі разоў хацелася яму праведаць, як жывецца Гнедку ў агульным табуне, але не мог. Стараўся забыцца, ды дзе там! Усё здавалася Купрыяну, што зараз зойдзе ў хлеў, а там стаіць яго конік і жуе сена. Але гэта былі толькі летуценні.

Жыць у галечы з сям'ёй з кожным днём рабілася ўсё цяжэй. І вырашылі яны з жонкай пайсці ў калгас.

— Мы ж не якія-небудзь калекі, — сказала Антаніна. — Я буду працаваць у полі, а цябе, можа, возьмуць конюхам. Там і Гнядка свайго пабачыш.

Але людзі мяркуюць адно, а здараецца зусім другое. Адна бяда не ходзіць, а за сабою другую водзіць. У гэтую ж ноч Купрыяна з усёй сям'ёй забралі і вывезлі на пасяленне ў Архангельскую вобласць як сацыяльна шкодны элемент. Застаўся толькі Кудлік — адзінокі і нікому не патрэбны.

Дзверы ў хату Купрыян забіў дошкамі. Аднак рамы з шыбамі хтосьці выцягнуў. Печ і комін разабралі па цаглінцы. Паступова двор пачаў зарастаць крапівой, лапушнікам і травой. Асірацелы Кудлік бегаў па вёсцы ў пошуках ежы. Папрашайнічаў, палахліва заглядваў у чужыя двары, адкуль яго праганялі і бязлітасна білі. Калі надыходзіла цемра, Кудлік плёўся да Купрыянавай хаты і каля сваёй будкі пачынаў жаласліва скуліць. Скулёж яго пераходзіў у надрыўнае выццё, быццам зваў кагосьці адгукнуцца на яго пакуты і сардэчную боль. Потым, галодны і знядужаны, засынаў.

Раніцою Кудлік падоўгу ляжаў, скруціўшыся ў клубок. Горка і тужліва глядзеў на хату з пустымі прасмамі вокан, на апусцелы двор, зарослы бур'янам, на плакаўшую "чырвонымі" слязьмі рабіну.

Аднойчы спазаранку Кудліку пачулася знаёмае конскае фырканне. Забілася, закалацілася сабачае сэрца, быццам памутнеў яго розум, калі, выбегшы на вуліцу, убачыў знаёмую постаць каня. Кудлік кінуўся каню насустрач. Заскакаў, закруціўся, заскавытаў і пачаў церціся аб конскія ногі. Гнедка спыніўся і, як быццам у адказ, заржаў, ускінуўшы галаву. Ад шчасця Кудлік перакуліўся з боку на бок. А Гнедка, з заскарузлай шэрсцю, з выпіраючымі рэбрамі, сумна глядзеў на яго. Калі б Гнедка мог гаварыць, то паведаміў бы, як цяжка жывецца яму ў калгасе. Толькі крычаць, мацюгаюцца ці б'юць бізуном яго мужыкі. Штосьці кальнула яго конскае сэрца, бо павярнуў ён галаву ў бок Купрыянавай хаты, і на вачах яго навярнуліся слёзы. Кудлік глядзеў на Гнядка сваімі разумнымі вачыма. Цяпер разам яны адчувалі сябе блізкімі і роднымі душамі.

Стаяўшыя недалёка дзве бабулі здзівіліся. "Глядзі, конь плача", — прагаварыла адна. Другая, задумаўшыся, дадала: "Мусіць, і ў жывёлы ёсць чалавечая душа".

Вознік, нібы прачнуўшыся, моцна хлестануў пугаю каня. Гнядок, уздрыгануўшыся, матнуў галавою, сумна зірнуў на Кудліка і рушыў з месца.

Кудлік бег за Гнядком то з боку, то забягаючы наперад і без перапынку брахаў. Мужык, нагнуўшыся, сцебануў сабаку. Кудлік, азлобіўшыся, зарычаў і пачаў кідацца ў бакі. Конь перайшоў на бег, і сабака, баючыся адстаць, кінуўся скачкамі за возам.

На прыканцы вёскі Кудлік раптам спыніўся. Ледзь дыхаючы, высунуўшы язык, стаў глытаць паветра. Відаць, змарнелы ад голаду, ён не мог бегчы далей за возам. Кудлік сеў сярод дарогі і не сышоў з месца да самага цямна. Чакаў, што вернецца Гнедка, і жаласліва паскульваў. Калі зусім сцямнела, улёгся з краю дарогі і, углядаючыся ў цемру, стаў трывожна прыслухоўвацца.

Раптоўна падняўся восенькі парывісты вецер. Ен мёў і круціў апалае лісце, перамешваючы яго з дарожным пылам. Неба пачало пакрывацца свінцовымі хмарамі, якія ляцелі нізка і хутка. Неўзабаве пайшоў дождж. Ён абліваў Кудліка сваімі халоднымі і калючымі, як іголкі, кроплямі. Кудлік прыўзняў морду і працягла завыў ад смутку і болю.

Дождж набіраў сілу і хутка перайшоў у навальніцу. Кудлік некалькі разоў спрабаваў прыўзняцца, але не мог. Моцная хваля дажджу і ветру скаціла яго ў прыдарожны равок. Дзесьці зусім блізка праграмеў гром, але Кудлік яго ўжо не чуў.

Пад раніцу дождж прыпыніўся. Неба пачало праясняцца. Па размытай ад вадзянога шквалу дарозе Гнедка вяртаўся з лясніцтва. Нагружаны дровамі воз час ад часу вяз у багністай каляіне. Раззлаваны вознік лаяўся і сцябаў каня пугай. Гнедка, выбіваючыся з сіл, ледзь пераставуляў ногі. Калі воз параўняўся з тым месцам, дзе ляжаў Кудлік, то стомлены Гнедка і не заўважыў сабаку, які так і не дачакаўся яго. Толькі вознік, знарок кінуўшы погляд у равок, пазнаў сабаку. Здзіўлена пацісцнуў плячыма і прамармытаў: "Глядзі ты, здох! З чаго б гэта?" і, усміхнуўшыся ў вусы, паехаў далей.

Восенькі вецер зрываў апошняе лісце з кустоў і пакрываў імі нерухомае цела Кудліка. У блакітным небе чуўся гоман адлятаючых у цёплыя мясціны птушак, але хутка і ён змоўк у далёкай вышыні...

Уладзімір СВЯТЛОЎ.

Бордо: стадион в центре города

Известная своими винами столица Аквитании имеет в арсенале стадион, внесенный в список исторических памятников, который находится в самом центре города. Благодаря ему Бордо сможет с успехом принять участие в чемпионате мира по футболу 1998 года.

Страж аквитанского бассейна, омываемый волнами близкой Атлантики, готовится принять у себя шесть матчей, запланированных в рамках чемпионата мира по футболу. Город стремится показать себя с лучшей стороны — умением окрасить любые события в теплые, задушевные тона.

Бордо находится на расстоянии 560 км на юго-запад от Парижа. Этот город с богатым историческим прошлым хочет воспользоваться предоставившейся ему возможностью, чтобы разрушить имидж холодности, который обычно ему приписывают. Подготовка города к мероприятию была поручена созданной полтора года назад специальной службе при мэрии города Бордо. С какой целью? Разместить болельщиков в черте города и тем самым дать возможность городу и региону получить выгоду от их присутствия.

К счастью, организаторы имеют в своем распоряжении стадион "Парк Лескур", рассчитанный на 36.500 мест и расположенный в самом центре города. Этот стадион является историческим памятником, и — еще одна его интересная особенность — по решению мэра города, бывшего премьер-министра Алена Жюппе, матчи на нем будут проводиться только днем. Такой график объясняется особым географическим положением Бордо — город находится на крайнем западе страны. Летом солнце заходит очень поздно, лучи его могут светить в глаза игрокам и ухудшать качество телевизионного



изображения.

Для того чтобы мероприятие прошло успешно, стадион подвергся ремонту и реконструкции. Первая очередь строительных работ по установке трибун в северном и южном секторах стадиона была завершена в марте 1997 года. Вторая очередь началась в июне и закончится в конце марта 1998 года. Она включает в себя три комплекса работ: создание огромного пресс-центра, способного принять журналистов со всего мира и оборудованного всевозможными средствами для передачи информации, модернизацию помещений, предназначенных для игроков, и расширение трибуны для прессы в соответствии с масштабностью события.

Чтобы решить проблемы финансирования строительства, возникшие между городом и регионом, муниципалитет выделил из своего бюджета дополнительные 20 миллионов франков (3 миллиона долларов). Общая стоимость работ оценивается в 51,5 миллиона франков (8 миллионов долларов), и после их завершения стадион должен превратиться в спортивное сооружение высокого класса.

Продажа билетов в Бордо также идет по плану. Уже давно раскуплены билеты I категории на все шесть матчей (один из них входит в 1/8 финала), предназначенные для французских болельщиков. Входные билеты из категории "престиж", право на приобретение которых имели региональные фирмы, были распроданы за несколько часов. Данная инициатива исходила от Торгово-промышленной палаты и имела целью рекламу продукции и фирм региона на этом мероприятии международного масштаба.

В городе Бордо решено было продумать все буквально до мелочей, чтобы, как того горячо желает Жан-Луи Гаше, ответственный за организацию мероприятия в Бордо, подарить самим себе "несколько счастливых мгновений".

Жан-Филипп КОИНТО.

Мужские разговоры

Для "Лады" — нет награды

